неабходна ўключыць яе ў вучэбныя планы як спецыяльную дысцыпліну, арыентаваную на азнаямленне з асновамі імправізацыі або з паглыбленым яе вывучэннем. У залежнасці ад пастаўленых задач неабходна распрацаваць рабочыя праграмы з комплексам патрабаванняў адпаведнага накірунку. Пажадана было б часцей праводзіць навуковыя канферэнцыі, лекцыі, круглыя сталы па праблемах развіцця навыкаў імправізацыі, актыўней прапагандаваць перадавы вопыт. Магчыма прыняць меры па арганізацыі канцэртных і паказальных выступленняў выдатных баяністаў-імправізатараў, а можа, і падумаць наконт правядзення адпаведных фестываляў ці конкурсаў. Мы ўпэўнены, што закранутая намі тэма хвалюе шматлікіх музыкантаў і даследчыкаў. Спадзяемся, што імправізацыя на баяне ў хуткім часе выйдзе на якасна новы ўзровень і стане неад'емнай часткай палітры выразных выканальніцкіх сродкаў баяніста XX стагоддзя.

*С.П. Васільева*

## Развіццё нацыянальнай народна-інструментальнай выканальніцкай школы: да пастаноўкі пытання

Даследаванне гісторыі сусветнага музычнага мастацтва немагчымае без вывучэння гісторыі станаўлення і развіцця нацыянальных выканальніцкіх і педагагічных школ, іх традыцый і асаблівасцей. Менавіта музычныя культуры асобных нацый і народнасцей складаюць скарбніцу сусветнага музычнага мастацтва.

На Беларусі праблема развіцця нацыянальнай культуры актуалізавалася ў апошнія гады, пасля набыцця нашай краінай дзяржаўнасці. Асаблівая ўвага надаецца мастацкай культуры рэспублікі, у тым ліку музычнай культуры. Творы беларускіх кампазітараў і нацыянальныя выканальніцкія школы — адна з галоўных састаўных частак музычнай культуры рэспублікі, якая непасрэдна ўплывае на фарміраванне нацыянальнай мастацкай культуры. Таму трэба дэталёва вывучаць і беларускую музыку, і выканальніцтва, і асаблівасці фарміравання нацыянальных выканальніцкіх школ.

На сённяшні дзень у мастацтвазнаўстве, у тым ліку і ў музыказнаўстве, тэрмін "школа" не знайшоў пакуль свайго агульнапрынятага азначэння і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трактуецца па-рознаму. Калі ў галіне выяўленчага мастацтва і архітэктуры шматлікія азначэнні гэтага тэрміна можна знайсці ў энцыклапедыях, то ў галіне музычнага мастацтва азначэння тэрмінаў "школа", "выканальніцкая школа" наогул не існуе. І тым не менш яго вельмі часта ўжываюць выканаўцы, кампазітары, выкладчыкі.

Тэрмін "школа" грэчаскага паходжання. Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі "школай" называлі гутаркі філосафаў з іх вучнямі і паслядоўнікамі на вольныя тэмы. А з цягам часу тэрмін "школа" пачалі выкарыстоўваць для азначэння асобных напрамкаў у якой-небудзь галіне навукі, літаратуры, мастацтва (1).

У галіне мастацтва тэрмін "школа" трактуецца часам у больш вузкім сэнсе слова, як спосаб навучання мастацкаму рамяству, майстэрству, тэхніцы. Так, у музыцы "школай" называюць падручнікі, мэта стварэння якіх — азнаёміць з метадыкай першапачатковага навучання ігры на якім-небудзь інструменце. Такія падручнікі звычайна складаюцца з метадычных каментарыяў і рэпертуарных зборнікаў, напрыклад, "Школа игры на фортепиано" (пад рэд. А. Нікалаева); "Школа игры на трехструнной домре" (В.С.Чуніна) і інш.

Да больш шырокага сэнсу паняцця "школа" нас вяртае "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя": "Школа ў мастацтве і архітэктуры — група мастакоў ці мастацкіх твораў, звязаных агульнымі творчымі прынцыпамі, традыцыямі, прафесійнымі прыёмамі, часам тэматыкай. Тэрмін "школа" ўжываецца як вызначэнне нацыянальна-стылявой характэрнасці або цыкла твораў, выкананых вучнямі і паслядоўнікамі якога-небудзь вялікага майстра"(2).

У "Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі" паняцце "школа" разглядаецца ў архітэктуры і выяўленчым мастацтве: "Школа ў архітэктуры характарызуе нацыянальную архітэктуру краіны, рэгіёна, калі своеасаблівасць выяўлена ў пэўных стылявых і храналагічных межах; таксама творы архітэктуры, выкананыя вучнямі і паслядоўнікамі значнага майстра. У архітэктурных навучальных установах пад кіраўніцтвам вядомага архітэктара часам ствараюцца групы ці майстэрні, члены якіх аб'яднаны поглядамі і ідэямі. Выпрацаваныя гэтымі групамі найбольш устойлівыя архітэктурна-мастацкія прынцыпы і манеры вызначаюць архітэктурную школу навучальнай установы, адыгрываюць значную ролю ў развіцці сусветнай архітэктуры. ... У выяўленчым і дэкаратыўна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыкладным мастацтве: 1)мастацкі кірунак, плынь, прадстаўленыя групай вучняў і паслядоўнікаў якога-небудзь мастака або групай мастакоў, блізкіх па творчых прынцыпах і мастацкай манеры; 2) жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва рэгіёна, якія вылучаюцца своеасаблівасцю ў пэўных стылістычных і храналагічных межах; 3) нацыянальнае мастацтва Беларусі" (3).

На наш погляд, гэтыя азначэнні паняцця "школа" можна перанесці на галіну музычнага мастацтва. Такім чынам, мы можам разумець пад паняццем "школа" групу музыкантаў або выканаўцаў (калі гаварыць аб выканальніцкай школе), звязаных агульнымі творчымі прынцыпамі, пераемнасцю традыцый, прафесійнымі прыёмамі, нацыянальна-стылявымі асаблівасцямі.

Адначасова школа — гэта і спосаб навучання. Пацвярджэнне таму мы знаходзім у вядомага мастацтвазнаўцы прафесара Л.А.Барэнбойма, які займаўся гісторыяй і тэорыяй выканальніцкага майстэрства і значную ўвагу надаваў паняццю "выканальніцка-педагагічная школа". Ён падкрэсліваў, што тэрмін "школа" трактуецца па-рознаму. Напрыклад, адны асацыіруюць паняцце "школа" з канкрэтнымі тэхнічнымі навыкамі, другія да тэхнічных навыкаў дадаюць музычна-выразныя прыёмы, трэція звязваюць разам эстэтыка-стылявыя погляды, мастацка-выразныя сродкі і пэўныя рысы выканальніцкага майстэрства. Але і апошняе, найбольш распаўсюджанае і шырокае азначэнне паняцця "школа" з'яўляецца аднабаковым, таму што гаворка ідзе толькі аб тым, "чаму вучыць", а тое,"як вучыць", застаецца па-за ўвагай. А між тым узаемасувязь гэтых двух момантаў вельмі часта і вызначае жыццяздольнасць школы.

Такім чынам,падкрэслім, што ў паняцце "выканальніцкая школа" трэба абавязкова ўключаць і педагагічны момант, іншымі словамі, спосаб навучання выканаўцаў, тым больш што гады навучання становяцца адным з галоўных фактараў фарміравання выканальніцкага майстэрства музыкантаў. Вядомы заснавальнік ленінградскай фартэпіяннай школы Л.В. Нікалаеў у паняцце "школа" таксама ўключаў "не толькі эстэтычны і тэхнічны, але і педагагічны фактары" (4).

Не менш значным з'яўляецца і яшчэ адзін фактар — рэпертуар. Менавіта тое, "праз што вучыць", аказвае непасрэдны ўплыў на фарміраванне асобы выканаўцы, на развіццё выканальніцкага майстэрства. Безумоўна, творы, на ўзорах якіх адбываецца працэс



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навучання, павінны быць высокамастацкімі. І зразумела, што адно з галоўных месцаў у рэпертуары кожнага выканаўцы займае нацыянальная музыка. Яна з'яўляецца адным з вядучых фактараў у фарміраванні выканальніцкага стылю музыканта і ў станаўленні нацыянальнай выканальніцкай школы наогул.

Падводзячы вынік, адзначым, што ў паняцце "выканальніцкая школа" неабходна ўключыць: агульныя творчыя прынцыпы, пераемнасць традыцый, выканальніцкае майстэрства, методыку навучання і рэпертуар.

Калі мы працягнем наш аналіз і звернемся да вакальнага выканальніцтва, то ў "Вакальным слоўніку" знойдзем такое вельмі важнае, на наш погляд, тлумачэнне: "Вакальная школа — сістэма выканальніцкіх прынцыпаў і педагагічных метадаў, якія фарміруюцца ў музычнай культуры народаў розных краін. У нацыянальнай школе адлюстроўваюцца асаблівасці псіхалагічнага складу дадзенага народа, яго музыкі, паэзіі, мовы, выканальніцкіх традыцый" (5).

Зразумела, у інструментальнай выканальніцкай школе таксама павінны праявіцца асаблівасці псіхалагічнага складу народа, яго музыкі, мовы, выканальніцкіх традыцый. Выкананне заўсёды суб'ектыўнае, яно нясе на сабе адбітак чалавечай індывідуальнасці, якасцей асобы, сярод якіх вялікая роля належыць і нацыянальным асаблівасцям характару. У сувязі з гэтым магчыма гаварыць аб спецыфіцы нацыянальных школ.

Нацыянальны элемент выканальніцтва выступае як характэрны нюанс, які змяняе сам сэнс мастацкай з'явы. Аднак ён заўсёды разглядаецца ва ўзаемасувязі з інтэрнацыянальным. Выканальніцтву музыкантаў розных краін, вядома, уласцівыя рысы падабенства, і даволі значныя, але толькі ў суайчыннікаў гэтыя рысы асабліва блізкія. Толькі творчасць вядомых выканаўцаў краіны вызначае нацыянальную самабытнасць выканальніцкага стылю і праз гэта – нацыянальную самабытнасць выканальніцкай школы.

Вядомы рускі мастак І.Н.Крамской адзначаў: "... Каб быць у мастацтве нацыянальным, аб гэтым клапаціцца не трэба — неабходна толькі даць поўную свабоду творчасці. Пры поўнай свабодзе творчасці нацыянальнасць, як стыхійная сіла, натуральна (як вада па ўхіле) будзе наскрозь прапітваць усе творы мастакоў дадзенага племені, нават калі б яны, па асабістых сваіх сімпатыях, і былі далёкія ад народных матываў" (6).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, адзначым, што выканальніцкі стыль з'яўляецца своеасаблівай праекцыяй комплексу нацыянальных псіхалагічных рыс на выкананне і важным кампанентам нацыянальнай выканальніцкай школы.

Трэба адзначыць, што на фарміраванне выканальніцкіх школ уплывае і сістэма музычнай адукацыі, якая склалася ў пэўных рэгіёне ці краіне. Менавіта на аснове прафесійнай музычнай адукацыі і пачынаюць інтэнсіўна фарміравацца прафесійныя *выканальніцкія школы*. Вопыт гістарычнага развіцця пацвярджае, што сённяшнія дасягненні ў галіне выканальніцкага майстэрства сталі магчымымі дзякуючы рабоце музычных навучальных устаноў, якія ўяўляюць стройную сістэму трох узроўняў: *школа — вучылішча — ВНУ*.

Абапіраючыся на ўсё вышэйсказанае, можна заключыць, што *выканальніцкія школы* асобнай краіны ці рэгіёна заўсёды нясуць у сабе нацыянальныя асаблівасці. Гэтыя асаблівасці звязаны з псіхалагічным складам народа, яго мовай, музыкай, выканальніцкімі традыцыямі; асаблівасцямі гістарычнага і культурнага развіцця грамадства; спецыфікай сістэмы музычнай адукацыі ў дадзеным рэгіёне і праяўляюцца праз нацыянальна-стылявыя асаблівасці.

Такім чынам, паняцце "нацыянальная выканальніцкая школа", на наш погляд, уключае наступныя фактары:

1) агульныя творчыя прынцыпы;
2) пераемнасць традыцый;
3) выканальніцкае майстэрства;
4) методыку навучання;
5) рэпертуар;
6) нацыянальна-стылявыя асаблівасці.

Можна сцвярджаць, што для выяўлення асаблівасцей нацыянальнай выканальніцкай школы неабходна разглядаць агульныя творчыя прынцыпы, пераемнасць традыцый, выканальніцкае майстэрства, методыку навучання, рэпертуар і рабіць гэта ў сувязі з асаблівасцямі гістарычнага і культурнага развіцця пэўнай краіны; асаблівасцямі псіхалагічнага складу народа, яго музыкі, мовы, выканальніцкіх традыцый; асаблівасцямі сістэмы музычнай адукацыі ў гэтым рэгіёне. Усе гэтыя фактары ў сваёй узаемасувязі і вызначаюць сутнасць паняцця "нацыянальная выканальніцкая школа".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальныя асаблівасці фартэпіяннай, скрыпічнай і іншых выканальніцкіх школ на сённяшні дзень ужо выяўлены. І вельмі цікава было б разгледзець гэтыя асаблівасці на прыкладзе домравай і балалаечнай выканальніцкіх школ. Як вядома, домра і балалайка былі распаўсюджаны ў Расіі і толькі ў XX стагоддзі перанесены на беларускую глебу.

У нашай рэспубліцы працэс фарміравання домравай і балалаечнай выканальніцкіх школ праходзіў тымі ж шляхамі, што і на тэрыторыі Расіі. Узнікаюць пытанні: ці ёсць у беларускім домрава-балалаечным выканальніцтве якія-небудзь нацыянальныя асаблівасці, ці аказалі ўздзеянне на фарміраванне домрава-балалаечнай выканальніцкай школы на Беларусі дух народа, яго менталітэт, асаблівасці гістарычнага і культурнага развіцця? Спадзяемся, што ў далейшым мы зможам адказаць на іх.

---


1. Педагогическая энциклопедия. — М., 1968. — Т.4. — С.699.
2. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. — Мн., 1974. — Т. 11. — С. 335.
3. Школа // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5-ці т. — Мн., 1987. — Т.5. — С. 575.
4. Баренбойм Л. За полвека: Очерки. Статьи. Материалы. — Л., 1989. — С. 115.
5. Коченева И., Яковлева А. Вокальный словарь. — Л., 1988. — С. 15.
6. Крамской И.Н. Об искусстве. — М., 1988. — С. 40.
7. Алексеев А. История фортепианного искусства: Учебник в 3-х частях. — М., 1988.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ